**Маніфест дэмакратыі ўяўлення**

*быў адзінагалосна прыняты*

*на Асамблеі дэлегатаў*

*падчас 85-га Сусветнага Кангрэсу*

*Міжнароднага ПЭНа*

*ў Маніле, Філіпіны*

*2 кастрычніка, 2019*

**Маніфест дэмакратыі ўяўлення**

Першыя словы Хартыі Міжнароднага ПЭНа сцвярджаюць, што літаратура не ведае межаў. Гэта тычыцца не толькі межаў рэальных, але, што не менш важна, і межаў уяўных.

ПЭН выступае супраць паняткаў нацыянальнай і культурнай чысціні, што імкнуцца перашкодзіць людзям слухаць, чытаць і вучыцца ў адно аднаго. Самацэнзура -- адна з самых небяспечных праяваў цэнзуры, якая выбудоўвае сцены вакол уяўлення, часта ўзведзеныя страхам агрэсіі.

ПЭН верыць, што ўяўленне дазваляе пісьменнікам і чытачам пашыраць уласнае месца ў свеце, узбагачаючы яго ідэямі іншых. Такім месцам для некаторых пісьменнікаў была турма, у якой уяўленне азначала ўнутраную свабоду і пачасту выжыванне.

Уяўленне -- гэта прастора ўсіх адкрыццяў, бо ідэі ажыццяўляюцца тады, калі іх нехта стварае. Часта менавіта ў гэтым спалучэнні супярэчнасцяў, закладзеных у метафарах і параўнаннях, і заключаецца найглыбейшы чалавечы досвед.

Цягам амаль 100 гадоў ПЭН падтрымлівае свабоду выказвання. Аднак ПЭН таксама падтрымлівае і верыць у чулае ўяўленне і прызнае, што многім не пашчасціла расказаць свае ўласныя гісторыі.

**Міжнародны ПЭН прытрымліваецца наступных прынцыпаў:**

1. Мы абараняем уяўленне і верым, што яно вольнае, як мары.

2. Мы прызнаем і спрабуем супрацьстаяць абмежаванням, з якімі сутыкаюцца многія людзі, распавядаючы свае гісторыі.

3. Мы верым, што ўяўленню даступны ўвесь чалавечы досвед, і адмаўляем абмежаванні ў часе, прасторы ці паходжанні.

4. Мы ведаем, што спробы кантраляваць уяўленне могуць прывесці да ксенафобіі, нянавісці і расколу.

5. Літаратура перакрочвае ўсе рэальныя і ўяўныя межы і заўжды знаходзіцца ў сферы ўніверсальнага.